– Дети к нам сами стремятся, всегда при поступлении есть конкурс. Причем, когда спрашиваем, почему выбирают лицей, говорят, что друзья посоветовали, – отметил Алексей Бычковский. – В лицее учатся только старшеклассники, 200 человек в параллели. Мало того, что ребят объединяют общие цели, так еще и возраст, поэтому здесь присутствует особый лицейский дух, которого нет в других школах.


ПРЫЗЫЎ. 4 лістапада ў ГДК прайшлі ўрачыстыя провады прызыўнікоў, якіх адабралі для службы падчас восеньскага прызыву. Як расказаў «ІР» начальнік прызыўнога пункта Баранавіцкага АГВК Аляксандр Барчанкоў, хлопцаў з аркестрам правялі ад ваенкамата да ГДК, дзе адбыўся канцэрт і сябры ветэранскага аб'яднання ўручылі юнакам позвы для адпраўкі ў вайсковыя часці.

Служба. Супрацоўнік Баранавіцкага ваенкамата расказаў «ІР» аб нюансах і

Восенню Баранавіцкі ваенкамат

Арцём ГАРБАЦЭВІЧ
ARTYOM@INTEX-PRESS.BY

Восеньскі прызыў на вайсковую службу пачаўся ў жніўні і працягнецца да канца лістапада. Аб тым, як праходзіць прызыўная кампанія, «ІР» расказаў начальнік аддзела прызыву на вайсковую службу Баранавіцкага АГВК Аляксандр Барчанкоў.



Аляксандр Барчанкоў – начальнік аддзела прызыву на вайсковую службу Баранавіцкага АГВК.

ФОТА: ДЗМІТРЫЙ МАКАРЭВІЧ, «INTEX-PRESS»



19-гадовы Сяргей на прыёме ў отарыналарынголага падчас праходжання прызыўной камісіі.

ФОТА: ДЗМІТРЫЙ МАКАРЭВІЧ, «INTEX-PRESS»

– Як праходзіць прызыўная кампанія?

– Усё ідзе як мае быць. Сёлета мы плануем папоўніць шэрагі айчыннага войска на 250 чалавек – гэта жыхары Баранавіч і раёна. А адпраўляць хлопцаў служыць пачнем з 17 лістапада, калі ўсе пройдуць камісіі і суразмову з прадстаўнікамі часцей.

– Дзе служаць баранавіцкія прызыўнікі?

– Большасць ірвецца служыць у элітных часцях: памежная служба, сілы спецаперацый, часці МУС. І калі маральныя якасці такіх людзей адпавядаюць іх пажаданням, то мы ідзем насустрач і са свайго боку спрыяем адпраўцы ў гэтыя падраздзяленні.

Што датычыцца геаграфіі, то тут амаль уся краіна – Слонім, Гродна, Мінск, Мар'іна Горка, Брэст. Аднак шмат баранавіцкіх хлопцаў служаць у мясцовых часцях – гарнізон у нас вялікі. Ды і часта бацькі прыходзяць і просяць: маўляў, нашаму б служыць бліжэй да дома, і яму, і нам прасцей будзе. Тут таксама можам пайсці насустрач.

А яшчэ ёсць такая катэгорыя – «куды пашлюць, там і паслужу».

– Што палохае прызыўнікоў у службе?

– Менавіта прызыўнікі ніякіх страхаў не агучваюць, больш панікуюць бацькі: А ці добра карміць будуць? А ці няма «дзедаўшчыны»? А ці не заганяюць там сына фізічна? А ці прыжывецца ён у новым калектыве?

Усіх намагаемся супакоіць і тлумачым, што датычыцца той жа «дзедаўшчыны», шмат чаго перавялічана ці засталося на ўзроўні стэрэатыпаў за савецкім часам. Сёння ў нас штогод адбываецца аптымізацыя колькасці ўзброеных сілаў – войска робіцца менш, і сачыць за вайскоўцамі ідэолагам ўсё прасцей. Дысцыпліна пабудавана жалезная. Канечне, могуць узнікаць нейкія канфлікты на асабістай глебе, але гэта нельга назваць рэгулярнай з'явай.

А каб зваладаць з праблемамі адаптацыі – новым рэжымам і фізічнымі нагрузкамі, хлопцам звычайна не трэба шмат часу.

– Што карыснага для жыцця хлопец можа вынесці з войска?

– Апускаючы нейкія маральныя якасці – тут усё індывідуальна, можна адзначыць атрыманне новых ведаў. Так, мне вядомы выпадак, калі чалавек у войску атрымаў спецыяльнасць пажарнага і цяпер працягвае працаваць ужо ў МНС. Таксама нашае заканадаўства дазваляе з тэрміновай службы пераходзіць на кантрактную праз шэсць месяцаў. Іншымі словамі, служба робіцца працаю – у часць, дахаты, заробак. Аднак, калі такога вайскоўца звольняць, а ён яшчэ не адпрацаваў два гады, то яму прыйдзецца даслужваць свой тэрмін.

Ды і нават калі хлопец не лічыць службу ў войску карыснай для сябе, то гэта ўсё роўна развязвае яму рукі ў плане будавання кар'еры і жыцця – часта прыходзяць такія, у каго ёсць права на адтэрміноўку але яны імкнуцца служыць, абгрунтоўваючы, што «раней пойдзеш – раней пры-

ОБЪЕЗД. По 12 ноября движение автобуса №15 осуществляется в объезд в связи с проведением работ по капитальному ремонту тепловой камеры по ул. Чернышевского. Автобус №15 едет по маршруту: ул. Баранова – ул. Советская – ул. Курчатова – ул. Притыцкого – ул. Чернышевского. В выходные дни с 9.00 до 15.00 вместо ул. Курчатова – по ул. Коммунистической. Вводится остановочный пункт «Рынок» по ул. Притыцкого (в районе магазина «Анвой») при движении в сторону м-на Боровки.

складанасцях прызыву ў войска

адправіць на службу 250 чалавек

йдзеш». Бо, калі малады чалавек не адслужыць, могуць узнікнуць праблемы ў працаўладкаванні. Ды і вечна «бегаць» і «касіць» ад арміі мала ў каго атрымліваецца.

– А шмат такіх, хто «косіць»?

– Безумоўна, ёсць людзі, якія не хочуць служыць – хаваюцца ад ваенкамата, не прыходзяць па позвах. За гэта ў Беларусі прадугледжана крымінальная адказнасць і мы перадаем справы такіх людзей у міліцыю. Ужо органы ўнутраных спраў іх шукаюць і адпраўляюць на суд. Звычайна ўхілісты атрымліваюць вялікія штрафы – да 150 базавых велічынь, могуць «зарабіць» і арышт. Аднак пасля першага суда жаданне ўхіляцца ад войска ў хлопцаў знікае. І хоць вядома, што судзімых у войска не бяруць, у «нашых» артыкулах у Крымінальным кодэксе ёсць нюанс: чалавек, арыштаваны за ўхіленне, пасля адбыцця пакарання абавязаны адслужыць у войску.

– А калі хлопец дагледае хворых бацькоў, але адтэрміноўкі ў яго няма? Такіх таксама забіраеце?

– Для такіх людзей, а таксама для студэнтаў-завочнікаў, маладых спецыялістаў і некаторых іншых існуе служба ў рэзерве. Рэзервістаў забіраюць у войска на 30–40 дзён у год на працягу трох гадоў. Штопрызыў у нас прыблізна 20 месцаў для службы ў рэзерве, а жадаючых – як абітурыентаў у «МГИМО»! Кожную заяву разглядае камісія, і калі сямейнае становішча чалавека сапраўды цяжкае ці за прызыўніка хадайнічаюць з яго прадпрыемства, то такія грамадзяне маюць шанс трапіць у рэзерв.

«Калі б выпала адматаць час назад, я ўсё роўна пайшоў бы служыць»


ФОТА: АРХІЎ ВІТАЛЯ ТУРЛАЯ

Баранавіцкі хлопец Віталь Турлай сам пайшоў у войска за некалькі месяцаў да 27-годдзя – узросту, пасля якога на тэрміновую службу ўжо не бяруць.

– Я мог бы, канечне, «адкасіць». Вельмі проста – з’ехаць папрацаваць у Расію на пару месяцаў, напрыклад. Але падумаў, хай адбудзецца тое, што павінна – як Бог дасць. Прыйшоў у ваенкамат падчас восеньскага прызыву, але камісія зацягнулася – даабследванні розныя, аналізы... Праз гэта мае дакументы для службы позна аформілі, калі ўжо неабходную колькасць хлопцаў ваенкамат набраў. Але я вырашыў ужо ісці да канца і падчас веснавога прызыву зноў пачаў праходзіць камісію, хоць некаторыя сябры і адгаворвалі, а да 27-годдзя заставалася 3 месяцы. На гэты раз я паспеў прайсці ўсіх дактароў, і мяне адправілі служыць у чыгуначныя войскі ў Слуцк.

Цяпер магу сказаць, што ні аб чым не шкадую – ні аб кінутай працы, ні аб «страчаным» часе. Бо войска – гэта такое месца, дзе табе даецца магчымасць пераасэнсаваць сваё жыццё, можа быць, нават пачаць яго спачатку. Тут я навучыўся разбірацца ў людзях і зразумеў, колькі ў мяне насамрэч сяброў. І нават калі б выпала адматаць час назад, то я ўсё роўна пайшоў бы служыць.

Дзе звычайна служаць баранавіцкія прызыўнікі?



- **Мінск** – МУС, рота ганаровай варты.
- **Брэст** – МУС, сілы спецаперацыі, памежныя войскі.
- **Гродна** – мотастралковыя часці.
- **Пінск** – памежныя войскі.
- **Барысаў** – часць сувязі.
- **Мар'іна Горка** – сілы спецаперацый.
- **Слонім** – мотастралковыя часці.
- **Баранавічы** – часць сувязі, авіябаза, часць тэхнічнага абслугоўвання, часць супрацьпаветранай абароны, радыётэхнічныя войскі.

ДЕТСКИЕ ПОСОБИЯ. В Беларуси на 3,9% выросли детские пособия. Так, единовременное пособие при рождении первого ребенка с 1 ноября составляет 13 млн 960 тыс. 200 рублей, при рождении второго и последующих детей – 19 млн 544 тыс. 300 рублей. Размер ежемесячного пособия по уходу за ребенком в возрасте до 3 лет составляет: на первого ребенка – 2 млн 233 тыс. 950 рублей, на второго и последующих детей – 2 млн 553 тыс. 100 рублей, на ребенка-инвалида в возрасте до 3 лет – 2 млн 872 тыс. 200 рублей, сообщает БЕЛТА.

ПОГОДА. В ближайшие дни погодные условия будут определять теплые воздушные массы из Западной Европы. 5 и 6 ноября ожидается небольшая облачность, ночью и утром местами туман. Температура воздуха ночью +1/+7 , днем воздух прогреется до 11-16 градусов. В пятницу, 7 ноября, погода немного ухудшится. Ожидается небольшая облачность с прояснениями, ветер переменных направлений, днем порывы до 14 м/с, возможны осадки. Температура воздуха ночью составит +4/+9, днем от 11 до 15 градусов тепла.

№45 (1037) | 5 ноября 2014 года
страница 11
ГАЗЕТА «INTEX-PRESS»
WWW.INTEX-PRESS.BY

Стартует репетиционное тестирование

Елена ЗЕЛЕНКО
NEWS@INTEX-PRESS.BY

Первый этап репетиционного тестирования начнется 9 ноября. Проверить свои знания абитуриенты смогут в БарГУ.

Как считает Игорь Дубень, декан факультета довузовской подготовки БарГУ, самое важное для абитуриентов в репетиционном тестировании – методически подготовиться к ЦТ. Во-первых, научиться правильно распределять время для выполнения заданий. Во-вторых, абитуриент «в боевых условиях» демонстрирует свои знания. В-третьих, 3–5% абитуриентов во время тестирования допускают ошибки при заполнении бланков, избежать которые помогает репетиционное тестирование. «С репетиционным тестированием не следует тянуть до весны, лучше оставить время для устранения пробелов в знаниях», – посоветовал он.

Для прохождения РТ абитуриентам необходимо зарегистрироваться на факультете довузовской подготовки БарГУ по адресу: г. Барановичи, ул. Войкова, 21, корпус № 2, каб. 12, по тел. (0163) 45-87-99 либо с помощью Online-регистрации на сайте БарГУ. Оплата за участие в РТ – 50100 руб., оплатить можно в любом отделении АСБ «Беларусбанк». Все этапы тестирования будут проводиться в 11.00 по адресу: ул. Войкова 21, корп. №2. При себе иметь паспорт, квитанцию об оплате и гелевую ручку с черными чернилами.



Чтобы увереннее себя чувствовать на централизованном тестировании, выпускники могут уже сейчас попробовать свои силы. Июнь 2014 года.

ФОТО: ДМИТРИЙ МАКАРЕВИЧ, «INTEX-PRESS»

График проведения репетиционного тестирования

Код предмета	Предметы	1 ЭТАП ноябрь-декабрь 2014 г.	2 ЭТАП январь-февраль 2015 г.	3 ЭТАП март-апрель 2015 г.
03 05 07 08 09 10 11 14	Физика Химия Английский язык Немецкий язык Испанский язык Французский язык История Беларуси Всемирная история новейшего времени	09.11.2014, 07.12.2014	11.01.2015, 08.02.2015	15.03.2015, 05.04.2015
04 06 12 13	Математика Биология Обществоведение География	16.11.2014, 14.12.2014	18.01.2015, 15.02.2015	22.03.2015, 19.04.2015
01 02	Русский язык Белорусский язык	23.11.2014, 21.12.2014	25.01.2015, 22.02.2015	29.03.2015, 26.04.2015

Стиль. Что будет модно в зимнем сезоне и можно ли это купить в нашем городе?

Зимняя мода-2015: Голливудский шик или городское сумасшествие

Катя ЧИСТОПОЛЬСКАЯ
NEWS@INTEX-PRESS.BY

Модные тенденции приближающейся зимы противоречивы как никогда. Дизайнеры делают ставки на яркие меха, фольклорные мотивы и романтическое ретро. Какие новые тренды можно найти в барановичских магазинах и в какую стоимость обойдется погоня за модой, выяснила корреспондент «IP».

Приблизительная стоимость некоторых модных вещей в магазинах и на рынках города в ноябре 2014 г.

Шубы из стриженого бобрового меха..............................от 22 млн
Полушубок из мутона.......5,2 млн
Джемпер с комбинированным передом из нескольких мехов..240 000
Спортивная шапка-бини..от 150 000
Ботфорты.... от 750.000 – до 2,3 млн
Длинные перчатки.......... от 80 000 до 550 000

ЯРКИЕ КРАСКИ И ПАСТЕЛЬНЫЕ ТОНА

Палитра цветов грядущей зимой не даст модницам захандрить. Лазурь, королевский синий, сиреневый, терракотовый, желтый и коньячный – не самые типичные зимние цвета. Также в этом сезоне в гардеробы многих модниц вернется красный цвет.

Для тех женщин, кто еще не готов бросить вызов общественности, модельеры приберегли козырь в рукаве: пастельные оттенки – нежно-голубой, мятный, зефирно-розовый, нежный персиковый – достойный ответ серым зимним будням.

Актуальны в этом сезоне и яркие принты. Начиная с классических «клетки и гороха» и заканчивая оптическими иллюзиями. Девушкам, которые любят оригинальные вещи, придутся по душе актуальные в этом сезоне рисунки с изображением кистей рук.

В Барановичах много «принтованной» одежды. И хотя большинство принтов далеко от дизайнерских рисунков, интересные вещицы все-таки встречаются. А вот отыскать в городе пальто пастельного оттенка нам не удалось.

МОДНЫЙ ПАТРИОТИЗМ

Фольклорные мотивы присутствуют как в верхней одежде и аксессуарах, так и в самых романтичных и элегантных платьях сезона. Мировые дизайнеры предлагают взглянуть на «вышиванку» по-новому. Расшитые блузы, юбки и жакеты не только популярны, но и красивы. К сожалению, найти «вышиванку» в барановичском магазине не удалось, зато ее можно сшить под заказ.

СТИЛЬ «ПРЕППИ»

Образ девочки-отличницы из престижного колледжа – вот хит молодежного сезона 2015. Работая над стилем «преппи», дизайнеры постарались вложить в него как можно больше непосредственности и элегантности, собственно так и переводится с английского само слово «preppy». Аккуратные блузки с воротничками, вязаный жилет, берет и галстук, обувь на невысоком каблучке или на низком ходу – все это барановичские девушки смогут найти в магазинах нашего города, а вот строгую юбку в складку придется хорошенько поискать.

Повседневный комплект

Пальто цвета «кипарис» – 3,2 млн
Брюки черные – 340 000
Трикотажный жакет с кожаными рукавами – 450 000
Ботинки замшевые на танкетке – 535 000

Спортивный комплект

Куртка стеганая – 880 000
Брюки зеленые – 360 000
Джемпер – 340 000
Шапка с помпоном – 460 000
Палантин – 160 000

ФОТО: ДМИТРИЙ МАКАРЕВИЧ, «INTEX-PRESS»

Одежда предоставлена Домом торговли «Радуга»

РЕТРО

Все новое – хорошо забытое старое. Новый сезон обещает объединить в себе тенденции разных времен. Так из 50-х к нам в гардероб придут пышные юбки и платья-пальто с акцентом на талии, а из 60-х – элегантные прямые пальто, береты и водолазки.

БАБУШКИНА КОФТА

Вязаные, бесформенные вещи снова в моде, уже который сезон они не теряют актуальности. Этой зимой дизайнеры предлагают обзавестись не только свитерами, но и вязаными платьями, брюками и шарфами, носить все одновременно и не разбавлять женственными аксессуарами, а, наоборот, носить с обувью в мужском стиле, на грубой подошве.

ШУБЫ В ПОЛ И КАРАКУЛЬ

Будущей зимой как никогда популярны шубы из длинноворсного меха. «Грязный» и цветной мех, с кожаными или даже тканевыми вставками, сочетание натурального и искусственного меха, ассиметричные воротники – модные находки дизайнеров встречаются далеко не во всех магазинах нашего города.

А новое решение модельеров – ультрамодная «чубакка» – модель шубы с минимальным декором и максимально длинным мехом, поражающая своими яркими цветовыми решениями и названием – вводит продавцов в ступор.

Фаворитом же зимнего сезона стал каракуль. На модных показах этого сезона были представлены не только каракулевые шубы, но и жакеты, юбки и аксессуары. Найти каракулевую шубу в Барановичах оказалось непросто: в одних магазинах ее не было, в других – «уже продали».

Популярным фасоном остается трапеция. Особым спросом будут пользоваться шубы в пол, длина которых может достигать середины каблука. Любители коротких моделей смогут обзавестись полушубком без воротника, меховой курткой. Набирает популярность в этом сезоне меховой джемпер: воротник-стойка и трехчетвертной рукав отлично сочетаются с длинными перчатками. А эффектным дополнением вечернего образа станет меховое болеро и муфта. К сожалению, до нашего города эти модные тенденции пока не дошли.

САПОГИ ВЫШЕ КОЛЕНА, ПЕРЧАТКИ ВЫШЕ ЛОКТЯ

Этой зимой многие модницы могут вновь обзаводиться ботфортами – они снова актуальны! Тем более, учитывая то, что эти модели в буквальном смысле заполонили обувные витрины города. А длинные перчатки выше локтя не только дополнят платье, пальто или меховую накидку, но и сделают образ элегантным и женственным.

МЕХОВЫЕ СУМКИ И КОЖАНЫЕ ШАПКИ

Правило «выбирать сумку в тон обуви» давно перестало быть обязательным. В сезоне осень-зима 2014-2015 можно подбирать сумку в тон платья или пальто, а после первого снега дизайнеры рекомендуют обратить внимание на сумки с меховой отделкой, правда, найти такие в нашем городе непросто.

Что касается головных уборов, то в сезоне осень-зима 2014-2015 в тренде модели головных уборов необычной формы и расцветки. В моде по-прежнему объемные теплые и уютные шапки крупной вязки с затейливым узором и помпонами. Любителям уличного европейского стиля придутся по вкусу спортивные шапки-бини с минимумом декора. Ценителям классики советуем обзавестись шляпой-«колокольчиком» клош. Всего этого в нашем городе в избытке. Наиболее же востребованными модными головными уборами грядущей зимы станут шапки-ушанки из натурального меха, пуховые платки и кожаные фуражки «а ля полицейский». Однако по-настоящему стильной фуражки ни в магазинах, ни на рынках города нам найти не удалось, а предоставленные экземпляры, хоть и являлись кожаными фуражками, на деле были далеки от своих модных собратьев.

ОХОТА. Охотничий сезон на пушную дичь открывается с 1 ноября и продлится до 25 января. Охотиться можно будет на зайца-русака, зайца-беляка, белку, куницу каменную, куницу лесную, норку американскую, ондатру, хоря лесного. Барановичская межрайонная инспекция охраны животного и растительного мира просит информировать о замеченных нарушениях на круглосуточный телефон 8-0163-41-29-36.



Провизор Наталья Статкевич считает, что со временем покупатели привыкнут к нововведениям. ФОТО: ДМИТРИЙ МАКАРЕВИЧ, «INTEX-PRESS»

«Теперь фармацевты будут стараться сгладить ситуацию»

Ольга ПРОСТАК
OLGA@INTEX-PRESS.BY

Порядок отпуска лекарств в аптеках по рецептам изменился с 19 октября. Все рецепты на лекарственные средства, которые отпускаются по рецепту врача, теперь остаются в аптеке.

Изменение вызвано вступлением в силу постановления Минздрава №66 от 09.09.2014 г., которое приняли «с целью исключения самолечения, когда пациент самостоятельно принимает лекарства, не имея при этом точного диагноза, назначения врача, самостоятельно подбирает дозировку лекарств и может принимать препараты, которые способны принести вред».

До 19 октября в аптеках оставались и хранились рецепты на такие группы лекарственных препаратов как наркотические, психотропные, ядовитые лекарственные средства, на лекарства, выписанные для льготной категории граждан. А теперь – все. Кроме того, на одном бланке должен быть выписан только один препарат. Раньше, например, на одном бланке можно было выписать и препарат, и раствор к нему.

После вступления постановления в силу работники аптек столкнулись с повышенным объемом работы. Фармацевтам, провизорам нужно размещать дополнительную информацию, ориентировать человека на то, чтобы он сначала пошел на прием к врачу, а только потом пришел в аптеку с рецептом.

– Постановление вступило в силу 19 октября, люди еще не адаптировались, есть и жалобы. Конечно, теперь фармацевты будут стараться сгладить ситуацию. Я уверена, что уже через месяц люди привыкнут к новым правилам и вопросов по поводу рецептурного отпуска лекарств возникать не будет, – сказала «IP» на условиях анонимности заведующая одной из аптек.

– Работа осложнилась, теперь стараемся предлагать лекарства, которые не требуют выписки рецепта, если это возможно. Ведь бывает так, что врач уже отработал, а случай экстренный, – рассказала фармацевт аптеки по ул. Комсомольской.

В другой аптеке сообщили, что после вступления постановления в силу не только выросло число недовольных пациентов, но и увеличилось количество бланков, которых уже сейчас в аптеке стало заметно больше – скоро их будет негде хранить.

В то же время специалисты уверены в правильности нового, более строгого подхода к отпуску лекарств.

– Если раньше антибиотики принимались бесконтрольно, не был соблюден курс лечения, то теперь пациент вынужден будет обратиться к врачу, – отметили в аптеке.

С вступлением постановления в силу прибавилось работы и врачам.

– Увеличилось число пациентов. С одной стороны, хорошо, что пациенты, которые должны пройти обследование, приходят к врачу чаще. С другой, хронические пациенты, например гипертоники, вынуждены приходить каждые два месяца, в связи с тем, что рецепт остается в аптеке. Не всем это нравится, – рассказала пожелавшая остаться неназванной врач-терапевт.

Действительно, не все пациенты готовы часто обращаться в поликлинику за рецептом.

– У нас быстрее попасть на прием к президенту, чем к врачу за рецептом, – возмущалась пациентка, которой отказались в аптеке продавать лекарство без рецепта.

Расходы. Коты и собаки – не каждому по карману

Домашний питомец – дорогое удовольствие

Аляксей БЕЛЫ
NEWS@INTEX-PRESS.BY

Если вы решили завести кошку или собаку, готовьтесь к серьезным финансовым расходам. Содержание самой простой кошки, которую вам отдадут в подарок, обойдется в тысяч триста в месяц, а обычная дворняжка «потянет» на тысяч шестьсот.



Анастасия Сташевская все необходимое для своего питомца покупает в зоомагазине, приняв во внимание советы продавца Ксении Тригуб. ФОТО: АЛЕКСАНДР ТРИПУТЬКО, «INTEX-PRESS»

Пожилая соседка сетует: когда ее кошка ушла из дома и так и не появилась, она поначалу думала взять другого котенка, прочитав объявление в газете «Отдам в хорошие руки…». Но, подсчитав доходы (пенсия два с половиной миллиона, грядка огурцов, два кустика смородины) и расходы (поесть, коммуналку заплатить, внукам подкинуть), решила отказаться от этой затеи. Ведь содержание даже простого котенка сегодня чувствительно для обывательского кошелька. Судите сами.

Питание – основная статья расходов – даже небольшого «беспородного» животного семейства кошачьих обойдется не меньше, чем в двести-триста тысяч рублей в месяц: «КОТиКОРМ» стоит 25 тыс./кг, «Китикет» – 30 тыс./кг, куриная печенка – примерно столько же, Darling – 28,8 тыс./кг, а еще и молоко необходимо. Содержание собаки при нынешних ценах на продукты и производные от них также недешево. Корм «Чаппи» – 17,9 тыс./кг, «Рэкс» – 19 тыс./кг, а Royal-Canin уже 70–90 тыс.(!). Банка корма Pupil весом 1,25 кг обойдется в 29,1 тыс. руб.

Конечно, можно кормить домашних животных тем, что остается от вашего обеда или ужина, покупать недорогие крупы и варить каши. Но, как сказала продавец в зоомагазине, если вы любите своего питомца, то не станете на нем экономить. К тому же несбалансированное питание приводит к заболеваниям. А стоимость «медицинского» обслуживания четвероногих питомцев тоже еще та.

Как рассказали в Барановичской городской ветеринарной станции, животным при рождении и впоследствии ежегодно надо делать прививки против чумы, вирусного гепатита и бешенства. Прививка собаки против чумы российским препаратом обходится в 60 тысяч, а если препарат голландский и включает еще и прививку против бешенства – это уже 150 тысяч рублей. Прививка кошки против вирусных инфекций с использованием голландского препарата стоит 96 тысяч рублей, российского – 82 тысячи. Обработка против эктопаразитов обойдется владельцу от 20 тысяч, а ежеквартальная обработка против глистов – от 8 до 150. А чтобы решить проблему «несанкционированного» рождения котят или щенков, необходима стерилизация животных. И это обходится недешево. Так, стерилизация кошки в ветлечебнице обойдется в 430 тысяч рублей, кастрация кота будет стоить 130 тысяч. А стоимость кастрации собак вообще зависит от их веса, от того, сколько на это потребуется наркоза. Например, эта процедура для овчарки стоит около 550 тысяч рублей. А еще животное может просто заболеть, и расходы на его лечение выльются в круглую сумму.

Иногда жители обращаются и с просьбой усыпить животное. Как рассказал ведущий врач-терапевт городской ветстанции Андрей Волощик, в 90 процентах это происходит в тех случаях, когда животное очень старое или безнадежно заболело. Но и умереть животному стоит денег. Так, усыпить кота стоит 125 тысяч рублей, а собаку – 250, ведь препараты для усыпления тоже обходятся недешево. А если животное чувствует, ЧТО с ним хотят сделать (а оно чувствует!), и его невозможно отвезти в лечебницу автобусом? Значит, надо вызывать такси. Это тоже расходы.

Добавьте сюда еще необходимую для вашего питомца «экипировку»: ошейник, курточку для прогулок, искусственную косточку, противоблошный ошейник, специальный шампунь для ухода за животными, расчески, домики и т.п., и станет понятно, что содержание домашних животных в последнее время становится привилегией людей далеко не бедных. А простому обывателю, особенно одинокому человеку пенсионного возраста, тяжело потянуть даже обычную дворняжку.

Может, поэтому и пытаются некоторые хозяева решать проблемы содержания своих питомцев способом «с глаз долой из сердца вон». По словам охотоведа Николая Головина, некоторые жители, не имея возможности содержать своих питомцев и не решаясь на усыпление, проявляют к домашним питомцам весьма странную «жалость» – вывозят их в лесной массив или к какой-нибудь колхозной ферме и выпускают на волю, надеясь: «авось выживут». Николай Головин говорит, что не адаптированные к таким условиям проживания животные чаще всего гибнут. А если и выживают, то дичают, уничтожают зайчат, других мелких животных, а собачьи стаи нападают и загрызают даже молодых косуль. По словам Николая Головина, согласно статистике, которую ведут «зеленые», ежегодно по причине разорения гнезд и нападения других особей на пернатых в мире гибнет около миллиарда птиц. Да и встреча с брошенными животными на улицах города оставляет у жителей не только щемящее чувство, но порой и чувство страха от неконтролируемой агрессии.

В КАКУЮ СУММУ ОБХОДИТСЯ СОДЕРЖАНИЕ ДОМАШНИХ ПИТОМЦЕВ И УХОД ЗА НИМИ

	питание в месяц	противоблошный ошейник	расческа	шампунь	прививка против чумы	проезд в ветлечебницу	кастрация	усыпление
СОБАКА	600 – 800 тыс. руб.	15– 200 тыс. руб.	30 – 55 тыс. руб.	22 – 80 тыс. руб.	60 тыс. руб.	80 –100 тыс. руб.	500 тыс. руб.	250 тыс. руб.
КОШКА	250 – 500 тыс. руб.	15 – 125 тыс. руб.	28 – 40 тыс. руб.	20 –110 тыс. руб.	82 тыс. руб.	80 – 100 тыс. руб.	130 тыс. руб.	125 тыс. руб.

Дамба. Реконструкция дамбы на Мышанке откладывается на неопределенное время

Плотина может не перезимовать

Татьяна НЕКРАШЕВИЧ
NECRASHEVICH@INTEX-PRESS.BY

Реконструкция дамбы, запланированная на осень этого года, откладывается. Еще не решены вопросы объема работ и финансирования. Тем не менее, по оценкам специалистов, плотину может прорвать в любой момент.



Специалисты УКРСП «Барановичиремстрой» ежегодно снижают уровень воды в Мышанке, чтобы уменьшить нагрузку на дамбу.
ФОТО: ТАТЬЯНА НЕКРАШЕВИЧ, «INTEX-PRESS»

УРОВЕНЬ ВОДЫ СТАНЕТ НИЖЕ

В редакцию «IP» позвонили рыбаки: «Мышанку спускают. С пятницы убрали бревна, перекрывающие воде движение, уровень воды снизился». Действительно, осенью этого года планировался полный спуск водохранилища Мышанка. Делать это нужно было для того, чтобы заняться капитальным ремонтом дамбы.

Однако в УКРСП «Барановичиремстрой» опровергли тот факт, что Мышанку спускают.

– Мы просто несколько снизили уровень воды на реке, и делаем это каждый год, – пояснил директор УКРСП «Барановичиремстрой» Владимир Кудласевич. – В прошлом году накануне зимы мы также сбрасывали уровень воды на 40 см, чтобы из-за весеннего паводка плотину не прорвало.

МОЖЕТ ПРОРВАТЬ В ЛЮБОЙ МОМЕНТ

Дамба на реке Мышанка была построена в 1964 г. За 50 лет она серьезно не ремонтировалась. В этом году у переходного мостика плотины образовались ямы.

В 2013 г. специалисты ОДО «Брестская инженерная группа» провели техническое обследование старой плотины, которое показало, что железобетонные конструкции разрушаются. Специалисты выдали заключение: дамбу может прорвать в любой момент.

– Конструкции дамбы в таком состоянии, что могут не выдержать напора воды, которая грозит в любой момент перелиться через верх и разрушить плотину, – рассказал «IP» доцент кафедры природообустройства БрГТУ Николай Водчиц. – Практически разрушен низовой и верховой откосы, пострадали бетонные укрепления откосов берегов. Их лучше полностью реконструировать или заменить.

Специалисты порекомендовали срочно снизить нагрузку на дамбу, усилить или заменить конструкции.

ПОКА В ПЛАНАХ

Чтобы отремонтировать дамбу, воду с реки Мышанка надо спустить, иначе до конструкций плотины не добраться. Процесс это дорогостоящий и трудоемкий. Просчитать стоимость работ поручал еще бывший председатель Барановичского горисполкома Виктор Дичковский на заседании исполкома 4 апреля 2013 г. Тогда был разработан проект, который несколько раз дорабатывался: поправки вносились с учетом финансовых возможностей города. Планировали не только реконструировать дамбу, но и очистить дно водохранилища и пляжную линию. Однако пока никто не может сказать – что именно и когда предстоит сделать. Часть работ будет планироваться после спуска воды, которая наверняка «обнажит» еще ряд проблем, связанных с реконструкцией. Объем работ диктует сумма финансирования и источник.

– Проект реконструкции дамбы есть, но планировать работы пока невозможно, так как не решен вопрос финансирования. Эти вопросы будут рассматриваться в исполкоме. Пока вопрос по сбросу воды Мышанки на стоит, – подвел черту директор УКРСП «Барановичиремстрой» Владимир Кудласевич.

СМЕРТНЫЙ ПРИГОВОР. В Беларуси исполнен третий смертный приговор за текущий год. 4 ноября стало известно, что расстрелян приговоренный к смертной казни житель Гомеля Александр Грунов, сообщает ПЦ «Вясна». Напомним, в апреле были расстреляны 23-летний студент Павел Селюн и 45-летний Григорий Юзепчук. На сегодняшний день правозащитникам известно еще об одном осужденном, который ожидает исполнения приговора – 54-летнем Эдуарде Лыкове.

Гісторыя. Два розныя погляды на жыццё за савецкім часам ад жыхароў горада

Плюсы і мінусы СССР вачыма былых

7 лістапада – гадавіна бальшавіцкага перавароту, які ў падручніках называюць Кастрычніцкай рэвалюцыяй. У выніку да ўлады на тэрыторыі былой Расійскай імперыі прыйшлі камуністы і неўзабаве стварылі СССР. З гэтай нагоды «IP» пагаварыла аб жыцці за савецкім часам з людзьмі, якія маюць на гэта розныя погляды.



Савецкія грамадзяне ломяцца ў краму за дэфіцытным таварам.

ФОТА: FISHKI.NET

«Я студэнтам мог лётаць на самалётах»



Віктар Цяпін, старшыня баранавіцкага аддзела партыі «Справедливый мир»

АБ ЖЫЦЦІ СЁННЯ І ТАДЫ

У Савецкім Саюзе жыць было значна лепш, чым у сучаснай Беларусі. Як прыклад – гэта заробкі і даступнасць жылля. Вось сёння тут усё на доларах пабудавана, курсы валют, разлікі... А тады для нас неістотна было існаванне долара ўвогуле: у Саюзе былі свае грошы, якія людзі зараблялі і маглі дазволіць сабе толькі з аднаго заробку купіць, напрыклад, добры тэлевізар і яшчэ някепска пражыць да канца месяца.

Я яшчэ памятаю, як я, студэнт, купляў са стыпендыі квіткі на самалёт і ляцеў на Каўказ падарожнічаць. Ці могуць сучасныя студэнты так жыць? Здаецца, не.

Такім жа неверагодным сёння падасца бясплатнае жыллё – можна было атрымаць кватэру дзе захочаш. Праўда, трэба было пэўны час пачакаць. Дададзім сюды і цалкам бясплатную адукацыю і ахову здароўя.

АБ ЧЭРГАХ І «ЖАЛЕЗНАЙ ЗАСЛОНЕ»

Дэфіцыт і чэргі — гэта ўсё з'явілася толькі ў часы перабудовы, калі кіраўніцтва Саюза нарабіла шмат памылак. Астатні час усяго хапала, хаця, канечне, некаторую садавіну можна было ўбачыць толькі па святах – мандарыны, напрыклад. Я памятаю, як знянацку купіў і ўпершыню пакаштаваў бананы ў Пецярбурзе. З мясам, можа, і было напружана, але некалькі відаў каўбасы заўсёды ляжала на паліцах савецкіх крамаў. Таму я не сказаў бы, што наш гандаль быў дэфіцытны. І апраналіся ў Саюзе добра, хоць некаторыя і крычаць, што ўсе былі шэрыя. А што датычыцца Жалезнай заслоны, то мне гэтае замежжа было і непатрэбна – усё было ў гіганцкім Саюзе: горы, мора, лясы і стэпы.

АБ ПОСПЕХАХ САЮЗА

Савецкі Саюз быў без перавелічэнняў перадавой дзяржавай свету — мы першымі выйшлі ў космас, нашыя спартоўцы былі лепшыя ў свеце! А возьмем, напрыклад, балет – хто быў лепшы за нас у балеце? Мы перамаглі ў Другой сусветнай вайне, спынілі гітлераўцаў. А Амерыка да нядаўняга часу яшчэ працягвала купляць рухавікі для касмічных апаратаў, якія рабіліся ў Саюзе.

АБ РЭПРЭСІЯХ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Вось часта кажуць – рэпрэсіі, рэпрэсіі. Але паглядзіце – Купалу і Коласа ж не рэпрэсавалі. Значыць, яны не былі ворагамі народа. Трэба разумець, што пасля грамадзянскай вайны было шмат, так бы мовіць, ворагаў савецкай улады. І іх знішчалі. Вядома, што не заўсёды гэта было правільна, я асуджаю неабгрунтаваныя рэпрэсіі, але гэта гісторыя – што было, тое было. Тое ж самае датычыцца і калектывізацыі – дзяржаве трэба было яе правесці, правялі. Гэта ўжо адбылося і няма чаго аб гэтым гаварыць.

АБ ПАТРЫЯТЫЗМЕ І МАРАЛІ

Мы ўсе былі савецкімі людзьмі, любілі сваю дзяржаву, ганарыліся ёю. Для савецкіх хлопцаў было гонарам служыць у войску, і я не разумею сённяшняе пакаленне, якое баіцца салдацкіх ботаў. Яшчэ ў СССР не было панятку "кацап", "хач", "чурка" – усе адзін аднаго паважалі. Да і такой уседазволенасці не было – я ў юнацтве нават не ведаў, што такое наркотыкі. Праўда, хадзілі чуткі, што на Поўдні дзесьці кураць нейкую траву, але гэта было на ўзроўні баек.

Яшчэ што запомнілася – гэта агульнанародныя святы: 7 лістапада, 1 мая і г.д. Мы тады ўсе збіраліся – моладзь, дзяўчаты. Гулялі, святкавалі – сапраўднае шчасце было хадзіць на дэманстрацыі. Цяпер такога духу ўжо няма, для мяне развал СССР – трагедыя.

«Аб Савецкім Саюзе, як аб «Імперыі зла», трэба хутчэй забыцца»



Сяржук Гоўша, праваабаронца

АБ ЖЫЦЦІ СЁННЯ І ТАДЫ

Зболышага сёння мы працягваем жыць у законсерваваным Савецкім Саюзе – планавая эканоміка, аднапартыйная сістэма. Канечне, з абвяшчэннем незалежнасці пэўныя змены адбыліся – стала мажлівым ездзіць за мяжу, глядзець замежныя каналы. Але дзяржаўныя прынцыпы засталіся без зменаў: добра жыве той, хто набліжаны да ўлады. У Саюзе фактычна КПСС кіравала ад імя народа, які меў толькі адно права – працаваць за капейкі і калі-нікалі ездзіць на мора. Тое ж самае працягваецца і цяпер.

АБ ЧЭРГАХ І "ЖАЛЕЗНАЙ ЗАСЛОНЕ"

Першая асацыяцыя, якая прыходзіць пры ўзгадванні СССР – гэта чарга. Вялізарная чарга за ўсім – за каўбасою, за кватэраю, за машынаю. У Саюзе ж і адбылося знаёмства са словам "дэфіцыт", калі на цэлы натоўп людзей прыходзілася некалькі кілаграмаў мяса ў краме. А таксама нібыта "бясплатнае" жыллё – калі ты прыходзіў працаваць на завод, то цябе ставілі на чаргу атрымання кватэры. Пры гэтым пры звальненні чалавека з чаргі здымалі – чым не прыгоннае права?

Што датычыцца "жалезнай заслоны", то праз гэта ў грамадзян Саветаў не было магчымасці выехаць у замежжа і пабачыць штосьці новае, параўнаць са сваім жыццём. Мы ў вачах усяго астатняга свету былі нейкімі дзікунамі, камуністычнымі пудзіламі.

Вось і цяпер бачна, як краіны былога сацыялістычнага лагера намагаюцца як мага хутчэй адарвацца ад усяго савецкага. Яскравыя ўзоры – Польшча, Чэхія, Малдова. Аб чым тут казаць, калі дзякуючы "дапамозе" камуністаў усходняя Нямеччына дагэтуль не можа дагнаць заходнюю па ўзроўні жыцця. Тое ж самае адбываецца ў Карэі – у Паўднёвай робатаў ужо ствараюць, а ў Паўночнай усё рыхтуюцца ваяваць з ЗША і маюць у дзясяткі разоў слабейшую эканоміку. Адсюль вынікае, што беларусам для паспяховага развіцця аб Савецкім Саюзе, як аб "Імперыі зла", трэба хутчэй забыцца.

АБ ПОСПЕХАХ САЮЗА

Ну былі нейкія там поспехі ў галіне той жа касманаўтыкі, але гэта невялічкі па часе перыяд. Што мы маем цяпер? – Амерыканскі "Curiosity" ездзіць па Марсе, а мы дзе? Не бачу тут перамогі. Тое ж самае з Другой сусветнай вайной – мы ўжо 70 год святкуем 9 мая, а ў Нямеччыне жывуць лепш за нас. Дададзім сюды і камп'ютары, машыны – усё прыходзіла з Захаду, бо мы фактычна былі адсталаю краінаю, якая за кошт сваёй замкнёнасці і не разумела, наколькі яна адсталая. І менавіта ў Савецкім Саюзе заклалася прымаўка "Калі яны думаюць, што добра нам плацяць, дык няхай думаюць, што мы добра працуем".

Праз гэтую савецкую абыякавасць і звычку проста стаяць за станкамі, адпрацоўваючы свой час, у Беларусі і сёння не бачна прамысловых прарываў.

АБ РЭПРЭСІЯХ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

За часы панавання камуністаў тыя знішчылі мільёны людзей на прасторы ад Брэста да Уладзівастока. Асабліва гэта закранула Беларусь – тыдзень таму мы адзначылі 77-годдзе з дня "Крыштальнай ночы" беларускай культуры, калі толькі ў ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 года супрацоўнікі НКУС расстралялі ў мінскай турме сотню пісьменнікаў і інтэлігентаў. За што? За тое, што яны былі беларусамі. Гэта страшнае злачынства бальшавіцкай сістэмы. А калі глянуць на нашых суседзей – мільённыя ахвяры галадамораў ва Украіне, высяленне цэлых нацый у Чачні і Крыме. Усё да таго і шло, што крывавая імперыя, пабудаваная на касцях іншых народаў, мусіла спыніць сваё існаванне – немагчыма будаваць шчасце на гвалце.

Ды і кепска, калі ў краіне няма плюралізму. Адсюль і з'яўляліся «шэдэўральныя» ідэі кіраўнікоў СССР – то адзін усю краіну кукурузай засее, то другі абяцае пабудаваць камунізм за 20 год.

АБ ПАТРЫЯТЫЗМЕ І МАРАЛІ

Смешна казаць аб патрыятызме ў СССР, калі гэтае штучнае дзяржаўнае ўтварэнне развалілася пры першым жа сур'ёзным крызісе. Ды і вядомы факт, што ў такой «патрыятычнай» краіне, як СССР, падчас Другой сусветнай вайны з'яўляліся цэлыя арміі здраднікаў камуністычных ідэалаў: ОУН-УПА, Беларуская краявая абарона, «Лясныя браты», РОА генерала Уласава і шмат іншых.

Ды і чаго каштуе Афганская авантюра... У Саюзе ўвогуле жыццё чалавека нічога не каштавала, таму складана тут разважаць аб нейкай маралі. Плюс менавіта за савецкім часам беларусам прыдумалі нейкія фантастычныя герб і сцяг, якімі мы карыстаемся і сёння.

Баранавічы

грамадзян

Камуністы зладзілі сходку ў Мінску на Хэлоўін

Прадстаўнікі камуністычных партый краін былога Савецкага Саюза сабраліся на «XXXV з'езд КПСС», які прайшоў у мінулыя выхадныя ў новым будынку музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў сталіцы Беларусі.

На з'ездзе прысутнічалі кіраўнікі ўсіх буйных камуністычных партый СНД – старшыня КПРФ Генадзь Зюганаў, кіраўнік Кампартыі Малдовы Уладзімір Варонін, першы сакратар ЦК Камуністычнай партыі Украіны Пётр Сіманенка. Для апошніх – Вароніна і Сіманенкі, Мінск стаў свайго роду прытулкам іх светапогляду: не так даўно ў Малдове савецкую сімволіку забаранілі для выкарыстання, а ва Украіне камуністы не прайшлі ў Раду па выніках парламенцкіх выбараў. Але камуністы не згубілі аптымізму і пад лозунгам «Новы саюз братэрскіх народаў» праспявалі гімн Савецкага Саюза і раздалі дзясятку камуністычных маладзёнаў партыйныя білеты.

